***Носік А.А.***

**ДА ПЫТАННЯ АБ МЕСЦЫ МЕТАФАРЫ Ў ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ ПРАФЕСІЙНА АРЫЕНТАВАНАМУ МАЎЛЕННЮ І РЭАЛІЗАЦЫІ ВЫХАВАЎЧЫХ МЭТ**

*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт,*
*Мінск, Беларусь*

**Анатацыя**. У артыкуле разглядаюцца патэнцыйныя магчымасці метафары пры арганізацыі прафесійнага маўлення. Звяртаецца ўвага на асноўныя адукацыйныя задачы і накірункі ў працэсе вывучэння лексічных тэм.

*Ключавыя словы: лексіка, метафара, канцэпт.*

***Nosik A.A.***

**TO THE QUESTION OF THE PLACE OF METAPHOR IN THE PROCESS OF LEARNING PROFESSIONALLY ORIENTED SPEECH AND IMPLEMENTATION OF EDUCATIONAL PURPOSES**

*Belarusian State Medical University,*
*Minsk, Belarus*

**Abstract**. The article considers potential possibilities of metaphor in the organization of professional speech. It pays attention to the main educational tasks and directions in the process of studying lexical topics.

*Keywords: vocabulary, metaphor, concept.*

Сістэматычнае засваенне вучэбнага матэрыялу патрабуе распрацоўкі цэласнага і ўпарадкаванага курса па авалоданні беларускай мовай у якасці сродку прафесійнай камунікацыі. Дасягненне пажаданага выніку грунтуецца на пастаноўцы важных пытанняў і пошуку адказаў на іх. Як? чаму? навошта? – ключавыя пункты арганізацыі адукацыйнага працэсу, на падставе якіх праводзіцца своечасовая карэкціроўка метадаў, зместу і нават мэт навучання.

У названым кантэксце першачарговымі задачамі бачацца наступныя: вылучэнне і ўсведамленне нагляднага прагматычнага кампанента; акцэнтаванне ўвагі на ўзаемасувязі мовы як аб’екта лінгвістыкі і маўлення ў яго практычным увасабленні; падбор дарэчных камунікатыўных адзінак, іх семантычная і сінтаксічная рэалізацыя ў пісьмовай і вуснай сферах.

Міждысцыплінарныя сувязі этнапсіхалогіі, лінгвістыкі, лінгвакультуралогіі абумоўлены месцам мовы ў сістэме сумежных навук, паколькі яна арганічна ўваходзіць у любую сферу быцця. Без выкарыстання мовы немагчыма камунікацыя; дзякуючы мове адбываецца развіццё навакольнага свету, перадача і захаванне інфармацыі; мова выступае сродкам уздзеяння і пабуджэння да дзеянняў, фіксацыі сацыяльных адносін, а таксама захоўвае калектыўны вопыт і выступае састаўной часткай культуры [1, с. 72–74].

Функцыянаванне метафары ў прафесійным маўленні, безумоўна, акрэсліваецца вуснай моўнай плынню, якая дапускае эмацыянальнасць,

вобразнасць, спантаннасць выказванняў, а таксама зварот да здабыткаў фразеалогіі і парэміялогіі. “Мэта метафары – выклікаць уяўленне. Свет метафары – гэта свет вобразнага мыслення” [5, с. 111]. Пераасэнсаванне базавых значэнняў слоў і ўтварэнне новых на аснове падабенства формы, колеру, характарыстык паводзін, пахаў і смакавых уласцівасцей словам прысвойваюцца новыя сэнсы, цесна звязаныя з культурна-гістарычнымі каштоўнаснымі арыенцірамі народа.

Якасна арганізаваная работа пры вывучэнні лексічнага складу мовы накіравана на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу, пашырэнне ведаў пра намінатыўны і камунікатыўны патэнцыял роднай мовы і ўменне адчуваць мову. Так, здольнасць моўных адзінак набываць другаснае значэнне і ўжывацца ў новай намінатыўнай ролі з’яўляецца сведчаннем таго, што носьбіты мовы ў працэсе пазнання рэчаіснасці і камунікацыі вылучаюць новыя сістэмныя сувязі паміж з’явамі рэчаіснасці і іх адлюстраваннем у мове і здольныя да іх выкарыстанням ў дыскурсе. Выбар накірункаў значэння падмацоўваецца ведамі чалавека пра навакольны свет, вопытам і асяроддзем пражывання.

Пры тлумачэнні прыроды метафары важнае значэнне мае разгляд асноўных культурных канцэптаў – духоўных каштоўнасцей пэўнай этнічнай супольнасці. Характэрная іх асаблівасць заключаецца ў тым, што “яны апісваюць рэчаіснасць, але рэчаіснасць асаблівага роду – ментальную. І ўжо ва ўсякім выпадку, яны маюць па меншай меры адну вельмі цвёрдую падставу – літаральны сэнс звычаю, уяўлення, веравання, тэрміна, слова. Гэта кожны раз – зыходная кропка і далейшага развіцця канцэпта ў самой ментальнай рэчаіснасці, у сапраўднай калектыўнай свядомасці і ў развіцці гіпотэзы даследчыка, якую ён будуе на гэты конт” [4, с. 60]. Тэрмін “канцэптуальная метафара” ўведзены Дж. Лакофам (1993, 1995, 2004) [3]. Сэнс паняцця заключаецца ў тым, што ў аснову метафары закладваюцца канцэпты. У гэтым дачыненні варта звярнуць увагу на разгорнутае даследаванне Ю. С. Сцяпанава, прысвечанае галоўным праблемам ўзаемаадносін чалавека з навакольным асяроддзем і інтэрпрэтацыі гэтых пытанняў на моўным узроўні. Тут жа вылучаецца тэрмін “канцэпт”, якому аўтар дае наступнае вытлумачэнне: “гэта нібыта згустак культуры ў свядомасці чалавека; тое, у выглядзе чаго культура ўваходзіць ў ментальны свет чалавека. І, з другога боку, канцэпт – гэта тое, пасродкам чаго чалавек – радавы, звычайны чалавек, не “творца культурных каштоўнасцей” – сам уваходзіць у культуру, а ў некаторых выпадках і ўплывае на яе” [4, с. 43].

На сучасным этапе гуманітарныя навукі ва ўзаемасувязі накіраваны на вывучэнне “чалавечага ў чалавеку, яго суб’ектыўны свет, духоўны свет, асабістыя каштоўнасці і сэнс жыцця” [8]. Істотнае месца ў вывучэнні метафары займае паняцце “канцэпт”, разуменне якога імкнецца да фальклорных і этнаграфічных даследаванняў. Непасрэдна тэрмін “канцэпт” ужываецца ў больш вузкім сэнсе і адносіцца да “светапоглядных паняццяў”, якія складаюць важную аснову культуры і з’яўляюцца яе метамовай [6]. Канцэптуальныя метафары прынята ўпарадкоўваць у разрады ў залежнасці ад катэгарыяльнага статусу канцэпта, якія выступае ў ролі сферы-крыніцы пры метафарычнай праекцыі на сферу-мішэнь. Неабходна адзначыць, што функцыянаванне метафар

акрэсліваецца некалькімі ўзроўнямі – агульным і канкрэтным, – паміж якімі усталёўваецца свая іерархія. Так, метафары больш “нізкага” ўзроўню прымаюць якасці метафар больш “высокага” ўзроўню (метафары нізкага ўзроўню ствараюць кантэкст для метафар высокага ўзроўню, канкрэтызуючы некаторыя іх аспекты) [7].

Няма падстаў не згаджацца, што “нацыянальная мова ўплывае на разумовыя працэсы чалавека, яго ўспрыманне свету, трактоўку рэчаіснасці. Натуральна, што людзі думаюць “сродкамі ўніверсальнага прадметнага кода”, але гэта не значыць, што іх нацыянальная мова становіцца выключанай з разумовага працэсу. Моўныя катэгорыі, у той ці іншай ступені, накіроўваюць разумовыя працэсы, якія здзяйсняюцца ў мозгу моўцы” [2].

Такім чынам, метафарычныя намінацыі з’яўляюцца неад’емнай часткай працэсаў паўсядзённай камунікацыі. Матывацыйнай базай для фарміравання моўнай і канцэптуальнай карцін свету выступае народнага вопыту. Узаемасувязь гэтых кампанентаў вымагае сінтэзу дасягненняў сумежных гуманітарных дысцыплін для дасканалага вывучэння ўзаемасувязі чалавека, мовы і навакольнага асяроддзя.

**Літаратура**

1. Вундт, В. Психология народов / В. Вундт. – М.: Эксмо; СПб.: Terra Fantastica, 2002. – 864 с.
2. Гумерова, А. Т. Когнитивная и лингвокультурологическая организация концепта / А. Т. Гумерова. – Текст : непосредственный // Молодой ученый. – 2010. – № 7 (18). – С. 153–155. – URL: https://moluch.ru/archive/18/1856/ (дата обращения: 16.01.2023).
3. Лакофф Дж., Джонсон М. Метафоры, которыми мы живем: пер. с англ. / Под ред. и с предисл. А.Н. Баранова. – М. : ЕдиториалУРСС, 2004.
4. Степанов, Ю. С. Константы: Словарь русской культуры: Изд. 3-е, испр. и доп / Ю. С. Степанов. – М.: Академический Проект, 2004. – 992 с.
5. Телия, В. Н. Метафора в языке и тексте / В. Н. Телия. – М.: Наука, 1988. – 176 с.
6. Шершнёва, А. Н. Категория концепта в когнитивной лингвистике / А. Н. Шершнёва. – Текст : непосредственный // Филология и лингвистика в современном обществе : материалы II Междунар. науч. конф. (г. Москва, февраль 2014 г.). – Т. 0. – Москва : Буки-Веди, 2014. – С. 124–126. – URL: https://moluch.ru/conf/phil/archive/107/4877/ (дата обращения: 16.01.2023).
7. Концептуальная метафора strength is money в современном английском языке // Евразийский Союз Ученых – публикация научных статей в ежемесячном научном журнале. Филологические науки. [Электронный ресурс]. Режим доступа: https://euroasia-science.ru/filologicheskie-nauki/%D0%BA%D0%BE%D0%BD%D1%86%D0%B5%D0%BF%D1%82%D1%83%D0%B0%D0%BB%D1%8C%D0%BD%D0%B0%D1%8F-%D0%BC%D0%B5%D1%82%D0%B0%D1%84%D0%BE%D1%80%D0%B0-strength-is-money-%D0%B2-

%D1%81%D0%BE%D0%B2%D1%80%D0%B5%D0%BC/ (дата обращения: 15.01.2023)

8. Глоссарий. Психологическай словарь. [Электронный ресурс]. Режим доступа: https://www.psychologies.ru/glossary/15/paradigma/ (дата обращения: 23.05.2023)